# Памяти ученого

# Памяці вучонага

# To the memory of scientist

**Арнольд Ефимович МИХНЕВИЧ**

**Арнольд Яфімавіч МІХНЕВІЧ**

**Arnold Jafimavich MIKHNEVICH**



Беларуская навука і вышэйшая школа панеслі цяжкую страту: 23 мая 2020 г. у г. Кёльн (Германія) пасля працяглай хваробы пайшоў з жыцця Арнольд Яфімавіч Міхневіч, доктар філалагічных навук, прафесар, акадэмік Міжнароднай акадэміі навук Еўразіі, выдатнік народнай асветы, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі, аўтар больш за 600 навуковых прац.

Арнольд Яфімавіч прайшоў надзвычай плённы жыццёвы, навуковы і чалавечы шлях. Ён нарадзіўся 9 верасня 1936 г. у Мінску, у 1958 г. скончыў філалагічны факультэт Гомельскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута, з 1958 па 1960 г. працаваў настаўнікам у сярэдняй школе ў в. Бабічы Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці.

Ад самага пачатку ўваходжання ў навуку, будучы яшчэ толькі аспірантам акадэмічнага Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа, А. Я. Міхневіч абраў для свайго дысертацыйнага даследавання найноўшы граматычны метад – трансфармацыйны аналіз. Такі напрамак лінгвістыкі ў той час быў новым не толькі ў Беларусі, але і ў СССР. Так, яго паспяхова абароненая дысертацыя (1963), кіраўніком якой быў К. К. Атраховіч, а таксама манаграфія «Сінтаксічна непадзельныя словазлучэнні ў беларускай мове (трансфармацыйны аналіз)» (1965) сталі першымі навуковымі працамі ў лінгвістычным ландшафце Беларусі, заснаванымі на ідэях трансфармацыйнай граматыкі.

Не менш піянерскай для свайго часу па пастаноўцы і вырашэнні сінтаксічных праблем стала фундаментальная манаграфія А. Я. Міхневіча «Праблемы семантыка-сінтаксічнага даследавання беларускай мовы» (1976), а таксама абароненая аднайменная доктарская дысертацыя, дзе ўпершыню ў беларускім мовазнаўстве былі разгледжаны так званыя скрытаграматычныя катэгорыі, рэферэнтная спалучальнасць слоў, сінтаксічная ама-



CC BY NC

німія, змены ў семантыцы сінтаксічных адзінак пад уплывам пазамоўных і ўнутрымоўных фактараў.

На кожным этапе сваёй навуковай дзейнасці – ад аспіранта да рэктара і акадэміка – А. Я. Міхневіч здолеў пакінуць нешта адмысловае, эўрыстычнае, глыбокае, а спектр гэтай дзейнасці быў надзвычай шырокі: сінтаксіс, семантыка, рыторыка, этымалогія, русістыка, сацыялінгвістыка, тыпалагічнае мовазнаўства, супастаўляльная лінгвістыка, лексікаграфія, тэрміналогія, ідыяматыка, беларусістыка, лексічная стылістыка, семіётыка, культуралогія і інш. Яго навуковая цікавасць да ўсяго новага, кампетэнтнасць, энцыклапедычная дасведчанасць сталі падставай да ўключэння Арнольда Яфімавіча ў Міжнародную камісію па вывучэнні граматычнай структуры славянскіх моў пры Міжнародным камітэце славістаў, два саветы па абароне доктарскіх дысертацый у БДУ, навукова-выдавецкі савет «Беларускай энцыклапедыі», экспертны савет ВАК Рэспублікі Беларусь, які Арнольд Яфімавіч узначальваў з 1994 па 1998 г. За вялікі ўнёсак у развіццё беларускай навукі вучоны быў уганараваны знакам «Выдатнік народнай асветы» (1980), а неўзабаве ўзнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР (1982).

Прафесар А. Я. Міхневіч выключную ўвагу надаваў праблемам культуры мовы і рыторыцы, а маючы надзвычайныя папулярызатарскія здольнасці, на працягу многіх гадоў актыўна выступаў у якасці лектара таварыства «Веды» ў Беларусі і за яе межамі па праблемах прамоўніцкага майстэрства. Прычым пільная ўвага да беларускага слова рэалізавалася ім і на практыцы: Арнольд Яфімавіч перакладаў на беларускую мову творы розных паэтаў, сам пісаў вершы і эпіграмы пад псеўданімам Януш Няміга.

Навуковы і педагагічны лёс А. Я. Міхневіча цесна звязаны з Інстытутам мовазнаўства імя Якуба Коласа акадэміі навук БССР (1963–1983), Мінскім інстытутам паліталогіі і сацыяльнага кіравання (1983–1991), Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэтам (1991–1995), Беларускім дзяржаўным інстытутам праблем культуры (1995–2001), а таксама Беларускім дзяржаўным універсітэтам (2001–2009).

Да асноўных навуковых і вучэбна-метадычных публікацый А. Я. Міхневіча адносяцца кнігі «Сінтаксічна непадзельныя словазлучэнні ў беларускай мове (трансфармацыйны аналіз)» (Мінск, 1965), «Белорусский язык для небелорусов» (Мінск, 1973; у суаўтарстве) (перавыдавалася ў 1978, 1990, 2008 гг.), «Праблемы семантыка-сінтаксічнага даследавання беларускай мовы» (Мінск, 1976), «Словарь славянской лингвистической терминологии» (т. 1–2, Прага, 1977–1979; у суаўтарстве), «Ораторское искусство лектора» (М., 1977); (перавыдавалася ў 1986 г.), «Русско-белорусский разговорник» (Мінск, 1991), «Англа-беларускі размоўнік» (Мінск, 1992; у суаўтарстве), «Беларуская мова: энцыклапедыя» (Мінск, 1994; агульная рэдакцыя), арталагічны даведнік «Слоўка за слоўкам» (2006; у суаўтарстве) і многія іншыя.

Сваім самым значным поспехам у галіне этымалогіі А. Я. Міхневіч лічыў другі том «Этымалагічнага слоўніка беларускай мовы» і шэраг публікацый адпаведнай тэматыкі ў часопісе «Маладосць». Адной з апошніх важных друкаваных прац з'яўляецца раздзел «Беларуская мова» ў томе «Славянскія мовы» з энцыклапедыі «Языки мира» (М., 2005).

Пайшоў з жыцця таленавіты вучоны, сапраўдны настаўнік, высакародны чалавек. Балючая страта напаткала не толькі родных і сяброў А. Я. Міхневіча, але і яго шматлікіх вучняў, якім ён асабістым прыкладам, дарэчнымі парадамі і часам вельмі іранічнымі кансультацыямі даў правільны кірунак у жыццё – навуковае і чалавечае. А. Я. Міхневіч быў мудры і таленавіты педагог, які выхаваў некалькі пакаленняў прафесіяналаў-лінгвістаў, сярод якіх 15 кандыдатаў і 3 дактары навук.

Вучні і калегі прафесара А. Я. Міхневіча захапляліся і заўсёды будуць захапляцца ім як асобаю, у якой праявіліся найвышэйшыя чалавечыя каштоўнасці: годнасць, справядлівасць, дабрыня, павага да чалавека. Памяць пра яго будзе вечна жыць у сэрцах тых, хто меў шчасце яго ведаць, з ім працаваць і ў яго вучыцца.

***Ю. В. Назаранка***[1],
***Т. Р. Рамза***[2]

[1]*Юлия Викторовна Назаренко* – кандидат филологических наук, доцент; доцент кафедры белорусского языкознания филологического факультета Белорусского государственного университета.

*Юлія Віктараўна Назаранка* – кандыдат філалагічных навук, дацэнт; дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Julia V. Nazaranko*, PhD (philology), docent; associate professor at the department of Belarusian linguistics, faculty of philology, Belarusian State University.

E-mail: *julijanazarenko@mail.ru*

[2]*Татьяна Ростиславовна Рамза* – доктор филологических наук, доцент; профессор кафедры белорусского языкознания филологического факультета Белорусского государственного университета.

*Таццяна Расціславаўна Рамза* – доктар філалагічных навук, дацэнт; прафесар кафедры беларускага мовазнаўства філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Tatsiana R. Ramza*, doctor of science (philology), docent; professor at the department of Belarusian linguistics, faculty of philology, Belarusian State University.

E-mail: *ramza@bsu.by*